# Ад Совецкага Інформбюро

## Аператыўная зводка за 13 сакавіка

На працягу 13 сакавіка на паўднёвы ўсход ад **Данцыга**, нашы войскі, наступаючы на поўнач уздоўж усходняга берага **Віслы**, занялі населеныя пункты **Раймерсвальдэ, Нойтайхервальдэ, Фірцэнхубен, Брэскерфельд, Прангенаў, Нойкірх, Пальшаў**.

На паўночны захад ад горада **Гдыні** нашы войскі занялі населеныя пункты **Рэда, Полхаў, Брэзін, Асланін, Рутцаў, Гнездаў, Шварцаў, Халерава, Хлапаў.** За 12 сакавіка ў гэтым раёне ўзята ў палон больш 1000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

На 1-м **Беларускім** фронце, у баях за горад і крэпасць **Кістжынь (Кюстрынь)**, узята ў палон больш 3000 нямецкіх салдат і афіцэраў. У ліку палонных камендант крэпасці **Кістжынь**—палкоўнік **Кругер**.

У Венгрыі, на паўночны ўсход і ўсход ад возера **Балатон**, немцы, негледзячы на вялікія страты, прадаўжалі атакі буйнымі сіламі танкаў і пяхоты. У баях за 12 сакавіка ў гэтым раёне нашай артылерыяй знішчылі 45 нямецкіх танкаў і самаходных гармат і, акрамя гэтага, падбіта і ўзарвалася на нашых мінных палях 50 танкаў і самаходных гармат праціўніка.

На іншых участках фронта—пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 12 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 134 нямецкіх танкі і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 9 самалётаў праціўніка.

## На сходзе гарадской комсамольскай арганізацыі

12 сакавіка адбыўся гарадскі комсамольскі сход, прысвечаны вынікам работы XIII пленума ЦК ВЛКСМ. Прысутнічала 700 комсамольцаў.

З дакладам выступіў сакратар Бабруйскага абкома комсамола тав. Зінкевіч.

Дакладчык указвае, што XIII пленум ЦК ВЛКСМ ставіў сваёй задачай, на аснове вопыта работы комсамольскіх арганізацый у ваеннай абстаноўцы, выпрацаваць меры, практычнае ажыццяўленне якіх забяспечыла-б далейшае паляпшэнне палітыка-выхаваўчай работы сярод моладзі.

Бабруйская гарадская комсамольская арганізацыя працуе ў гэтым напрамку нездавальняюча.

Аснову работы комсамола складае ідэйна-палітычнае выхаванне шырокіх мас комсамольцаў і несаюзнай моладзі. Як-жа арганізавана вучоба комсамольскага актыва горада? Да гэтага часу гарком комсамола займаецца толькі размовамі аб вучобе, а па сутнасці комсамольцы і актыў не вучацца. Школа комсамольскага актыва ўжо ў трэці раз пачынае ўноў сваю работу. Станоўчых вынікаў пакуль няма. На апошнія заняткі, якія адбыліся 6 сакавіка, з'явілася толькі 50 проц. слухачоў. Самастойная вучоба комсамольцаў не арганізавана, лекцыі і даклады для комсамольцаў і моладзі не чытаюцца.

Па спісках гаркома комсамола ў горадзе лічыцца 26 комсамольскіх гурткоў. Але яны створаны фармальна. У гаркоме нават не ведаюць, чым яны займаюцца.

Выступаўшыя ў спрэчках таварышы ўказвалі на дрэнную пастаноўку фізкультурнай работы. Работнікі гаркома комсамола страцілі густ да спартыўна-абаронных мерапрыемстваў.

Нездавальняюча працуюць комсамольскія арганізацыі школ у справе выхавання навучаючыхся. Яны яшчэ не сталі сапраўднымі памочнікамі дырэктарам і настаўнікам.

У сваім выступленні намеснік дырэктара па палітычнай частцы рамесніцкага вучылішча № 7 тав. Бандарчук расказаў, што за апошні час у вучылішчы значна палепшылася выхаваўчая работа сярод моладзі, створаны гурткі па вывучэнню кнігі таварыша Сталіна „Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза", праводзяцца гутаркі і даклады.

У спрэчках выступілі т. т. Храмовіч—сакратар гаркома КП(б)Б, Баландзіна—сакратар гаркома комсамола, Пісчык—сакратар камітэта комсамола лесатэхнікума і іншыя, усяго 12 чалавек.

Сход прыняў канкрэтнае рашэнне, накіраванае на ажыццяўленне рашэння XIII пленума ЦК ВЛКСМ.

## Абласны агляд мастацкай самадзейнасці

З 25 лютага па 1 сакавіка ў Бабруйску праходзіў абласны агляд мастацкай самадзейнасці.

Дзесяткі мастацкіх калектываў і сотні індывідуальных выканаўцаў дэманстравалі сваё майстэрства перад грамадскасцю горада.

Журы агляда дало высокую ацэнку хору фабрыкі імені Халтурына. Выдатна выканаў ён песні „Свяшчэнная вайна", „Песня смелых". Цікавым было выступленне цымбаліста Леаніда Гарадзецкага.

Вялікім поспехам карыстаўся ў гледачоў калгасны хор вёскі Казловічы, Слуцкага раёна. Гэты хор да вайны прымаў удзел у дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Некалькі песен хора тады было запісана на грам. пласцінкі. Зараз на абласным аглядзе хор выдатна выканаў рад беларускіх народных песен.

Абласная камісія па правядзенню агляда прэміравала лепшых выканаўцаў каштоўнымі падарункамі і граматамі.

## Жулікі за прылаўкам

На работнікаў гандлёвай сістэмы ўскладзены вялікія задачы па правільнаму і культурнаму абслугоўванню спажыўцоў. Гэтыя задачы набываюць выключнае значэнне ў суровыя дні вайны, калі з прычыны ваеннага становішча ўстаноўлена строгае нарміраванне на дэфіцытныя тавары і прадукты.

Абмерванне і абвешванне пакупнікоў — **вялікае** зло, з якім павінна весціся бязлітасная барацьба ў гандлюючых арганізацыях. І, такім чынам, падбор кадраў гандлюючых работнікаў павінен стаяць у цэнтры ўвагі.

Між тым, факты гавораць за тое, што яшчэ некаторыя жулікі благапалучна гнездзяцца ў магазінах Бабруйска.

У магазіне № 7 горпрамхарчгандля доўгі час карыстаюцца кустарным метрам, які амаль на сантыметр менш стандартнага. Не цяжка падлічыць, якую выгаду мае з гэтага загадчык магазіна т. Шэх. З пакупніка па сантыметру, а загадчыку магазінам касцюм.

Днямі ў гэтым-жа магазіне прадаўшчыца Панкова адпусціла пакупніку 3 метры мануфактуры. Трох метраў у адрэзе, вядома, не аказалася; не хапала ні мала, ні многа 20 сантыметраў. Ды і сам адрэз па стандарту не адпавядаў матэрыялу, указанаму ў фактуры. Як гэты адрэз з'явіўся ў магазін ні загадчык, ні прадавец „не ведаюць".

Трэба спадзявацца, што горпрамхарчгандаль прыме адпаведныя меры, каб надалей агарадзіць пакупнікоў ад падобнага абслугоўвання.

**Н. Міхайлоўскі.**

### Па слядах неапублікаваных пісем

У рэдакцыю газеты „Совецкая Радзіма" паступіў матэрыял аб прапажы мяшка з карэспандэнцыямі на ст. Старыя Дарогі 13 лютага.

Пры праверцы факты пацвердзіліся. Вінаўныя работнікі Асіпавіцкага аддзялення перавозкі пошт па чыгунцы Давідовіч і Маліноўская прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці.

## Кантрольна-насенныя лабараторыі ў барацьбе за высокі ўраджай

Высокаякасная падрыхтоўка насення з'яўляецца адной з рашаючых умоў у справе атрымання высокага ўраджаю. Народная пагаворка выразна гаворыць: „што пасееш, то і пажнеш". Апошнія пастановы партыі і ўрада аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год і развіцця насеннаводства ў калгасах ставіць перад сельгасарцелямі канкрэтныя задачы, якія павінны павысіць ураджайнасць палёў. Перадавыя калгасы нашай вобласці заканчваюць вывазку розных угнаенняў на палі і своечасова ачысцілі і праверылі ў кантрольна-насенных лабараторыях увесь пасеўны матэрыял. Якім павінен быць пасеўны матэрыял, каб атрымаць ад яго высокі ўраджай? У першую чаргу трэба, каб ён быў чыстым, не меў у сваім саставе мёртвых прымесей.

Сарнякі вельмі пладавіты, і пагэтаму, калі з імі не весці энергічную барацьбу яны могуць выжыць культурныя расліны.

Вялікую ўвагу трэба яшчэ ўдзяліць захаванню зярна. Насенне з павышанай вільготнасцю дрэнна захоўваецца, а часта вільготнасць прыводзіць да самасагравання зярна і поўнай яго сапсаванасці.

Акрамя вышэйуказаных момантаў, якія адыгрываюць вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі насеннага матэрыялу да веснавой сяўбы, трэба яшчэ памятаць, што насенне павінна быць усхожым. Такім чынам, трэба праверыць насенны матэрыял у кантрольна-насенных лабараторыях на чыстату, вільготнасць, усхожасць. Акрамя гэтага, трэба яшчэ ведаць, ці заражона насенне сельскагаспадарчымі шкоднікамі і хваробамі. Усімі гэтымі пытаннямі займаюцца кантрольна-насенныя лабараторыі нашай вобласці.

Праверка насення павінна праводзіцца не менш 2 раз. Першы раз пасля засыпкі насенных фондаў і другі раз пасля ліквідацыі недахопаў, выяўленых першай праверкай. Другая праверка павінна быць закончана ўсімі калгасамі вобласці ў сакавіку, і да гэтага часу ўсе калгасы павінны мець дакументы, якія-б сведчылі аб прыгоднасці насенных фондаў да пасеваў.

Перадавыя раёны нашай вобласці перамаглі ўсе цяжкасці на сваім шляху і аднавілі кантрольна-насенныя лабараторыі, якія паспяхова працуюць. Да такіх адносяцца Слуцкая кантрольна-насенная лабараторыя (загадчык лабараторыі аграном тав. Стукач), які паказаў вялікую ініцыятыву па абсталяванню сваёй лабараторыі. Трэба яшчэ адзначыць добрую работу Старадарожскай кантрольна-насеннай лабараторыі (заг. тав. Піваварава), якая адна з першых па вобласці закончыла праверку насенных фондаў калгасаў раёна. Добра працуюць таксама Грэская, Бабруйская, Старобінская, Чырвонаслабодская кантрольна-насенныя лабараторыі.

Дрэнна паставілі работу кантрольна-насенныя лабараторыі Кіраўскага і Клічаўскага раёнаў, якія да гэтага часу яшчэ не прыступілі да праверкі насення.

Якія-ж вынікі праведзенай работы і якая якасць правераных насенных фондаў у калгасах нашай вобласці? Праверка ў кантрольна-насенных лабараторыях вобласці паказала, што вялікая колькасць зярна аказалася некандыцыйнымі па чыстаце і па ўсхожасці. Гэтыя факты асабліва б'юць трывогу аб тым, што некаторыя раёны дрэнна ачышчаюць насенны матэрыял.

Цяпер, калі мы знаходзімся напярэдадні 4-й ваеннай вясны, калгасы нашай вобласці павінны прыкласці ўсе свае намаганні, каб высокаякасна ачысціць насенны матэрыял ад сарнякоў і мёртвага смецця, а па ільнонасенню ачысціць ад такога паразіта, як павіліка, якая вельмі зніжае ўраджайнасць ільну.

Кантрольна-насенныя лабараторыі павінны стаць цэнтрам увагі калгасаў нашай вобласці ў справе падрыхтоўкі насенных фондаў да веснавой сяўбы.

**Т. Калабкоў,**
дырэктар абласной кантрольна-насеннай лабараторыі.

Адказны рэдактар
**Н. М. БУТРЫМОВІЧ.**

АФ. 049012 Адрас рэдакцыі: г. Бабруйск, Совецкая вуліца, 55.Тэл. 14. Друкарня імені Непагодзіна. Тыраж 10 тыс.